**Тэма 1. Прадмет курса. Агульная характарыстыка ранніх буржуазных рэвалюцый.**

1. Прадмет, асноўны змест курса.
2. Паняцце мадэрнізацыі, яе асноўныя шляхі.
3. Агульная характарыстыка рэвалюцый эпохі мануфактурнага капіталізму.

**Літаратура.**

Побережников, И.В. Переход от традиционного к индустриальному обществу: теоретико-методологические проблемы модернизации / И.В. Побережников. – М.: РОССПЕН, 2006.

Барг, М.А. Великие социальные революции XVII–XVIII вв./ М.А. Барг, Е.Б. Черняк– М.: Наука, 1990. – 254 с.

1. Прадметам курса з'яўляецца гісторыя ранніх буржуазных рэвалюцый у кантэксце мадэрнізацыйных працэсаў, якія вялі да фарміравання на Захадзе новага індустрыяльнага грамадства. Да задач курса адносяцца: 1) вызначэнне паняцця раннія буржуазныя рэвалюцыі і выяўленне тых гістарычных з'яў, якія адпавядаюць гэтаму паняццю. 2) Характарыстыка перадумоў і прычын ранніх буржуазных рэвалюцый. 3) Устанаўленне рухаючых сіл рэвалюцый. 4) Характарыстыка хода рэвалюцый, іх важнейшых падзей. 5) Выяўленне ролі рэвалюцый ў працэссе мадэрнізацыі заходняга грамадства ў Ранні Новы час.

Гістарычная навука пад паняццем рэвалюцыя разумее карэнны і хуткі пераварот у грамадскім і дзяржаўным ладзе краіны. Звычайна рэвалюцыя суправаджаецца ўзброенай барацьбой. Рэвалюцыя адбываецца ў сілу таго, што грамадска-палітычны рух ахоплівае шырокія колы народа. Заключаецца рэвалюцыя ў тым, што ўлада пераходзіць з рук адной сацыяльнай групы ў рукі другой. Рэвалюцыяй можа быць прызнаны і захоп улады вузкай групай людзей, ці нават адным чалавекам, калі гэта вядзе да глыбокіх перамен у дзяржаўнай сістэме. Тэорыя мадэрнізацыі патрабуе, каб гэтыя перамены мелі прагрэсіўны характар, забяспечвалі рух ад менш дасканалага грамадства да больш дасканалага.

Калі гаворка ідзе пра буржуазную па сваім характары рэвалюцыю, гэта азначае, па-першае, што дадзеная рэвалюцыя садзейнічала станаўленню буржуазных адносін, яна адбывалася ва ўмовах пераходу ад традыцыйнага грамадства да індустрыяльнага. Па-другое, што важную ролю ў гэтай рэвалюцыі адыграла буржуазія як сацыяльны клас, які адыгрывае галоўную ролю ў станаўленні буржуазных адносін. Для таго, каб вызначыцца з паняццем раннія буржуазныя рэвалюцыі, неабходна адштурхоўвацца ад перыядызацыі Новага часу. Сучасная гістарычная навука вызначае перыяд 16–18 стст. як Ранні Новы час. Да гэтага часу адносяцца тыя рэвалюцыі, якія мы адзначаем як раннія буржуазныя. Перыяд 16–18 стст. таксама характарызуецца як час мануфактурнага капіталізму. Менавіта ў гэты час

мануфактура склала найбольш дынамічна развіваючыся элемент прамысловасці. Таму раннія буржуазныя рэвалюцыі яшчэ могуць быць ахарактарызаваны як рэвалюцыі эпохі мануфактурнага капіталізму.

Зыходячы з прыведзенага азначэння паняцця рэвалюцыя, фарміруецца пералік тых падзей Ранняга Новага часу, якія могуць быць аднесены да буржуазных рэвалюцый. Гэта падзеі ў Германіі, звязаныя з Рэфармацыяй і Вялікай сялянскай вайной 1524–1525 гг. Рэфармацыя ваклікала глыбокія перамены перш за ўсё ў свядомасці немцаў, спробы змяніць сацыяльную і палітычную структуру. У сучаснай гістарычнай навуцы пераважае пункт гледжання аб Рэфармацыі і Сялянскай вайне як буржуазнай рэвалюцыі, якая пацярпела паражэнне. Неадназначная трактоўка як рэвалюцыі характэрна пры ацэнцы ў гістарыяграфіі падзей Фронды ў Францыі. Канцэпцыя, згодна якой, Фронда была буржуазнай рэвалюцыя, зыходзіць з таго, што ва ўмовах Фронды буржуазныя колы выступілі супраць палітыкі ўмацавання абсалютызму. Праціўнікі дадзенай канцэпцыі зыходзяць з таго, што буржуазія была яшчэ вельмі слабою, таму абсалютызм быў ёй у той момант патрэбны. Паміж буржуазіяй і каралеўскім урадам былі супярэчнасці. Напрыклад, буржуазія была незадаволеная высокімі падаткамі. Але яны не фарміравалі непрымальнасці манархіі. На першым этапе Фронду ўзначальвае Парыжскі Парламент (парламенцкая Фронда 1648–1649 гадоў). Аднак ён не быў органам французскай буржуазіі, а органам дваранства мантыі, які адстойваў шлях паступовага ўмацавання французскага абсалютызму ў рамках традыцыйнай прававой базы. Безумоўна да ліку ранніх буржуазных рэвалюцый адносяцца Нідэрландская рэвалюцыя 1566–1609 гг., Англійская рэвалюцыя 17 ст., Першая Амерыканская рэвалюцыя (Вайна за незалежнасць), Французская рэвалюцыя 1789–1799 гг., Брабантская рэвалюцыя, Бельгійская рэвалюцыя. Ёсць падставы аднесці да буржуазнай рэвалюцыі барацьбу за незалежнасць супраць Іспаніі Неапалітанскага каралеўства і Партугаліі ў сярэдзіне 17 ст.

2. У сучаснай гістарычнай навуцы для тлумачэння працэсу пераходу ад традыцыйнага грамадства да грамадства індустрыяльнага найбольш часта прымяняецца тэорыя мадэрнізацыі. Яна нацэльвае гісторыка на тое, каб разглядаць прыход індустрыяльнага грамадства на змену традыцыйнаму, ці аграрнаму, як макрапрацэс, сусветны працэс, які прыводзіць да з'яўлення: 1. Сучаснай дзяржавы, г. з. дзяржавы, якая мае ўстойлівую сістэму кіруючых органаў. Аснову якой складае бюракратычны апарат. 2). Узнікае складана арганізаванае, інтэграванага грамадства. Г. з. грамадства, якое ўключае шмат сацыяльных класаў, пластоў, якія цесна звязаны, актыўна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой. Яны рухомыя, людзі могуць перамяшчацца з аднай сацыяльнай групы ў другую. 3). Ствараецца сістэма пашыранай вытворчасці. Г. з., што ідзе пастаяннае павелічэнне аб’ёмаў вытворчасці. Яе аб’ёмы перавышаюць тое, што патрэбна для непасрэднага спажывання чалавека. Ключавым для тэорыі з’яўляецца паняцце «мадэрнізацыя». Пад ім разумеюць гістарычна працяглы працэс сацыяльных, палітычных, эканамічных, культурных і

інтэлектуальных трансфармацый, якія адбываліся на Захадзе з 16 ст. і дасягнулі свайго апагею ў 19–20 стст. Гэтыя трансфармацыі ўключаюць працэсы індустрыялізацыі ў эканоміцы, урбанізацыі ў сацыяльна-культурнай сферы, рацыяналізацыі ў свядомасці і навуцы, бюракратызацыі дзяржаўнага апарату, дэмакратызацыі дзяржаўнай улады, палітычнай сістэмы, зацвярджэння панавання капіталізму ў сацыяльна-эканамічных адносінах, распаўсюджвання індывідуалізму і матывацыі поспеху ў свядомасці людзей, ператварэнне навукі ў важнейшы фактар развіцця грамадства. Мадэрнізацыя ў гэтым сэнсе азначае працэс пераўтварэння традыцыйнага, або датэхналагічнага грамадства, па меры яго трансфармацыі, у грамадства, для якога характэрныя машынная тэхналогія, рацыянальныя і секулярныя адносіны, а таксама высокадыферэнцыраваныя сацыяльныя структуры.

Тэорыя мадэрнізацыі разглядае пераход ад традыцыйнага грамадства да індустрыяльнага як прагрэсіўную з’яву. Працэс мадэрнізацыі ў рамках класічнай тэорыі разглядаўся як ўсёабдымны, комплексны, гэта значыць не зводзіцца да якога-небудзь аднаго вымярэння, аднаго з бакоў грамадскага жыцця. Пераход ад традыцыйнасці да сучаснасці, згодна тэорыі мадэрнізацыі, выклікае змены практычна ва ўсіх абласцях чалавечай думкі і паводзін, выклікае працэсы індустрыялізацыі, урбанізацыі, камерцыялізацыі, спрашчэння сацыяльнай мабільнасці, секулярызацыі, нацыянальнай ідэнтыфікацыі, распаўсюджвання СМІ, пісьменнасці, адукацыі, станаўлення сучасных палітычных інстытутаў, пашырэння ўдзелу грамадства ў палітычным жыцці. Галоўнае адрозненне сучаснага грамадства ад традыцыйнага бачылася ў большым кантролі сучаснага чалавека над прыродным і сацыяльным асяроддзем, заснаваным на больш шырокім укараненні навуковых і тэхналагічных ведаў у практыку. Класічная тэорыя мадэрнізацыі параметры традыцыйнага і мадэрнага грамадстваў разглядае як дыяметральна супрацьлеглыя, гэта значыць у працэсе мадэрнізацыі павінен адбыцца поўны дэмантаж традыцыйнага грамадства і замена яго індустрыяльным. Традыцыйныя інстытуты і каштоўнасці разглядаюцца як перашкоды ў ходзе мадэрнізацыі, якія павінны падвергнуцца трансфармацыі.

Мадэрнізацыя ўяўляе сабой шматступенны працэс. Некаторыя аўтары кажуць пра чатыры фазы мадэрнізацыі: мануфактурная, індустрыяльная, познеіндустрыяльная і постіндустрыяльная. Разбурэнне традыцыйнай, сярэднявечнай, і фарміраванне новай сістэмы каштоўнасцяў у 15–16 ст. было звязана з такімі буйнымі гістарычнымі з'явамі, як Вялікія геаграфічныя адкрыцці, Адраджэнне, Рэфармацыя. Самая першая – раннекапіталістычная – мадэрнізацыя працягвалася з 16 да сярэдзіны 18 ст. Яе называюць мануфактурнай, бо асноўным яе вынікам было зацвярджэнне мануфактуры ў якасці пануючай форм вытворчасці. Пачатак другой, індустрыяльнай, мадэрнізацыі паклаў прамысловы пераварот канца 18 ст., у выніку якога былі створаны асновы індустрыяльнага грамадства. Яе завяршэнне ў большасці еўрапейскіх краін і ЗША прыпадае на другую палову 19 ст. Трэцяя, познеіндустрыяльная мадэрнізацыя ахапіла ўсю першую палову 20 ст. Яе вынікам было ўступленне краін Захаду ў «эру высокага масавага

спажывання». Апошняя постіндустрыяльная фаза мадэрнізацыі прыпадае на перыяд пасля Другой сусветнай вайны і працягваецца па цяперашні час. Нас будзе цікавіць першая фаза мадэрнізацыі, звязаная з эпохай мануфактурнага капіталізму. Менавіта на яе час прыходзяцца раннія буржуазныя рэвалюцыі. Таму гэты рэвалюцыі яшчэ называюць рэвалюцыямі эпохі мануфактрунага капіталізму.

У рамках тэорыі мадэрнізацыі прыарытэт аддаецца эвалюцыйным, г. з. плаўным паступовым зменам, вынікам якіх з'яўляецца замена структур традыцыйнага грамадства на структуры грамадства індустрыяльнага. У старым грамадстве паступова фарміраваліся і развіваліся элементы новага (уласнасць трэцяга саслоўя на зямлю, дзяржаўная цэнтралізацыя, таварна-грашовыя адносіны). Гэта быў паступовы і плаўны працэс. Асноўным інструментам яго ажыццяўлення былі рэформы зверху, якія праводзілі ўрады. У гэты працэс аказаліся ўстроенымі і раннія буржуазныя рэвалюцыі. Узнікае пытанне аб іх ролі ў працэсе мадэрнізацыі. Наколькі яны садзейнічалі мадэрнізацыі, ці, наадварот, яе, магчыма, тармазілі. Рэвалюцыйны шлях мадэрнізацыі меў на ўвазе карэнную ломку структур Старога парадку за кароткі гістарычны час. Меўся на ўвазе скачкападобны пераход да новых форм дзяржаўнасці, новай сацыяльнай структуры, новай мадэлі эканамічнага развіцця (буржуазных адносін). На сённяшні дзень абсалютная большасць гісторыкаў сходзіцца на тым, што раннія буржуазныя рэвалюцыі не сталі разрывам у грамадскім развіцці. Яны толькі паскаралі працэс перамен, які адбываўся эвалюцыйным шляхам. І пры гэтым вельмі не раўнамерна ў розных сферах грамадскага жыцця. У большай ступені пераварот адбываўся ў палітычна-прававой сферы. Значна менш ён закранаў эканамічную сферу, духоўны свет чалавека. Неабходна ўлічваць, што перадумовы рэвалюцый выспявалі ў працэсе папярэдніх эвалюцыйных перамен.

Яшчэ ў сярэдзіне 19 ст. такі французскі гісторык як Алексіс Таквіль указваў, што напярэдадні рэвалюцыі ў Францыі ўжо сфарміраваліся многія элементы Новага парадку: сялянская ўласнасць на зямлю, цэнтралізаванае кіраванне. Рэвалюцыя не ўнесла ў гэты працэс нічога прынцыпова новага, і пераход да новага грамадства паспяхова адбыўся б і эвалюцыйным шляхам. Сучасны французскі гісторык Франсуа Фюрэ лічыць, што феадалізм знік у Францыі яшчэ да пачатку рэвалюцыі, а яе заслуга заключаецца ў стварэнні новай дзяржаўна-палітычнай культуры. На тое, што пераход да новага грамадства не з'яўляецца заслугай толькі рэвалюцый, указвае і беларускі даследчык Якаў Рыер. Ён адзначае прымяняльна да Нідэрландскай рэвалюцыі, што ў Паўночных Нідэрландах у выніку яе ўтварылася незалежная буржуазная рэспубліка. Але гэтая падзея была падрыхтавана доўгім папярэднім развіццём сямі паўночных правінцый Нідэрландаў. Дваранства і феадальныя адносіны на гэтай тэрыторыі яшчэ да пачатку рэвалюцыі былі слабымі. А трэцяе саслоўе і ў горадзе, і ў вёсцы стварыла свае структуры – органы мясцовага самакіравання. Роля рэвалюцый заключалася перш за ўсё ў тым, што яны знішчалі найбольш непрымальныя ў

новых умовах элементы Старога парадку, якія ў найбольшай ступені перашкаджалі эвалюцыйнаму шляху мадэрнізацыі.

Неабходна адзначыць, што ўплыў рэвалюцый на працэсы мадэрнізацыі не абмяжоўваўся толькі тымі краінамі дзе яны адбыліся. Яны ўплывалі на іншыя краіны. У найбольшай ступені гэта дытычыцца Французскай рэвалюцыі канца 18 ст. У найбольшай ступені ўплыў адчуваўся ў ідэйнай сферы.

3. Фарміраванне перадумоў буржуазных рэвалюцый эпохі мануфактурнага капіталізму звязана з фарміраваннем новай сістэмы адносін ў розных сферах грамадскага жыцця: эканоміцы, палітыцы, духоўнай сферы. Што датычыцца эканомікі, то тут адбываецца станаўленне і развіццё капіталістычнага ўкладу. Ён фарміруецца ва ўмовах старой эканамічнай аграрнай сістэмы. Як правіла, да пачатку рэвалюцыі, ён не ператвараецца ў вядучы эканамічны ўклад краіны. Выключэнне тут складае Галандыя, дзе да пачатку Нідэрландскай рэвалюцыі капіталістычны ўклад стаў пануючым. І ЗША, бо англійскія калоніі ў Паўночнай Амерыцы не ведалі развітых феадальных адносін. Не атрымаўшы перавагі ў эканамічным жыцці, капіталістычны ўклад у рамках яшчэ старой эканомікі з'яўляецца найбольш дынамічна развіваючымся. Пры гэтым сучасная гістарыяграфія лічыць, што развітыя феадальныя адносіны ў тых краінах, дзе адбываліся рэвалюцыі, на момант іх пачатку не захаваліся. Актыўна ствараюцца мануфактуры, расце гандаль, перш за ўсё знешні, таварна-грашовыя адносіны пранікаюць у вёску. Чым больш хутка расце капіталістычны ўклад, тым больш ён сутыкаецца з перашкодамі, якія ствараюцца для яго развіцця старымі сацыяльна-эканамічнымі адносінамі і структурамі: цэхамі, гандлёвымі і прамысловымі манаполіямі, саслоўнымі прывілеямі. У палітычнай сферы развіццё новых адносін часта сутыкаецца з палітыкай манархіі, накіраванай на захаванне старых структур. Па меры развіцця капіталістычных адносін фарміруюцца новыя сацыяльныя слаі, перш за ўсё буржуазія, якія выказваюць прэтэнзіі на ўдзел у кіраванні дзяржавай. Ва ўмовах абсалютызму гэта было немагчыма. Таму рэвалюцыйныя сілы нацэлены на замену абсалютызму сістэмай дзяржаўнага кіравання, заснаванай на парламентарызме і канстытуцыяналізме.

Супярэчнасці паміж старым і новым у сацыяльна-эканамічнай сферы могуць быць вырашаны ці ў выніку правядзення рэформаў, ці ў выніку рэвалюцыі. Тое, на карысць рэвалюцыі ці рэформы будзе вырашана гэтая альтэрнатыва, у вялікай ступені залежыць ад палітычнага развіцця краіны, ад здольнасці ўлады ажыццявіць рэформы. Фарміраванне перадумоў рэвалюцыі ў палітычнай сферы паскараецца, калі дзяржаўная ўлада ў сваёй палітыцы аказваецца няздольнай улічыць патрэбы развіцця новых грамадскіх адносін. Абсалютызм у многіх еўрапейскіх краінах на ранніх этапах развіцця капіталістачнага ўкладу палітыкай меркантылізму садзейнічаў яго ўмацаванню. Але не трэба забываць, што еўрапейскія манархіі ў развіцці

гандлю і прамысловасці бачылі толькі сродак папаўнення сваёй казны. Пры гэтым абсалютызм як правіла кансерваваў старую сістэму сацыяльна-эканамічных адносін. Напрыклад, спробы каралеўскай улады забараніць агароджванні ў Англіі, умацаванне гарадскіх цэхаў Людовікам XIV, стварэнне манапольных гандлёвых кампаній у розных краінах. Такія меры абмяжоўвалі прадпрымальніцкую свабоду і выклікалі рост апазіцыі абсалютызму сярод буржуазіі горада і вёскі, яе ўцягванне ў рэвалюцыйную барацьбу. У другой палове 18 ст. альтэрнатывай рэвалюцыйнаму выбуху стала плітыка асветніцкага абсалютызму, правядзенне рэформаў, якія ліквідавалі найбольш адыёзныя элементы Старога парадку. Шэрагу краін, дзе такая палітыка праводзілася дастаткова актыўна, Аўстрыя, Прусія, удалося пазбегнуць рэвалюцый.

Важная роля ў фарміраванні передумоў рэвалюцый належала перавароту ў свядомасці людзей. Тут фарміруюцца ідэалагічныя передумовы рэвалюцый. Раннія буржуазныя рэвалюцыі першай хвалі мелі рэлігійную ідэалагічную аснову. У Германіі ва ўмовах Рэфармацыі і Сялянскай вайны ў якасці ідэйнай асновы выступілі лютэранства і радыкальныя народныя рэфармацыйныя вучэнні. Нідэрландская і Англійская рэвалюцыі мелі таксама рэлігійную рэвалюцыйную ідэалогі – кальвінізм. Кальвініскцкая рэлігія і выпрацаваная на яе аснове этыка паводзін як нельга лепш стымулявалі прадпрымальніцкую актыўнасць. Яны прапагандавалі дасягненне поспеху ў зямным жыцці, беражлівасць, тыя каштоўнасці, якія прызнаваліся важнымі для буржуазіі. Акрамя таго, кальвінізм аказаўся ў канфлікце з афіцыйнай царквой, якую падтрымлівала каралеўская ўлада, адпаведна, і ў канфлікце з гэтай уладай. Лагічна, што ён стаў ідэйным сцягам апазіцыі абсалютызму. Свядомасць людзей у 16 – першай палове 17 ст. заставалася яшчэ пераважна рэлігійнай. У сілу гэтага ідэйна-палітычная барацьба набывала рэлігійную афарбоўку, выступала як барацьба розных рэлігійных вучэнняў.

Сітуацыя змянілася ў 18 ст., калі ў Еўропе і Паўночнай Амерыцы распаўсюдзілася ідэалогія Асветніцтва. У свядомасці людзей стаў пераважаць свецкі погляд на грамадскія працэсы. Існуючыя грамадскія парадкі перасталі ўспрымацца як сакральна асвечаныя, каралеўская ўлада перастала ўспрымацца як божская ўлада. Менавіта Асветнітцтва стала ідэалогіяй буржуазных рэвалюцый 18 ст., Амерыканскай, Французскай. Гэта не азначае, што асветнікі ў сваіх творах непасрэдна заклікалі да паўстання супраць існуючай улады. Але Асветніцтва зрабіла мысленне чалавека свабодным, дазваляла асэнсаваць недахопы існуючага грамадства і неабходнасць яго перабудовы. Сфармуляваныя асветнікамі ідэі нацэльвалі чалавека на стварэнне больш дасканалага грамадства, абгрунтоўвалі неабходнасць пераходу да яго.

Агульная задача буржуазных рэвалюцый эпохі мануфактурнага капіталізму заключалася ў там, каб ліквідаваць перашкоды, якія стаялі на шляху развіцця буржуазных адносін. У Нідэрландах (за выключэннем Галандыі), Англіі, Францыі капіталістычны ўклад у эканоміцы і буржуазныя

адносіны ў палітычнай сферы на момант пачатку рэвалюцыі яшчэ на сталі пануючымі. Таму задача рэвалюцыі ў гэтых краінах заключалася ў тым, каб ліквідаваць старыя сацыяльна-эканамічныя адносіны, адкрыць прастор для развіцця капіталістычнага ўкладу і стварыць новую, адпавядаючую буржуазнаму грамадству, дзяржаўна-палітычную сістэму. Англійскія калоніі ў Паўночнай Амерыцы ў сваёй гісторыі не ведалі развітых феадальных адносін. На момант пачатку Першай Амерыканскай рэвалюцыі ў іх панаваў капіталістычны ўклад у эканоміцы. У палітычнай сферы сфарміравалася сістэма мясцовага самакіравання і прадстаўнічага праўлення, характэрная для буржуазнага грамадства. Таму трэба было ліквідаваць толькі асобныя элементы Старога парадку, а таксама абараніць склаўшуюся дэмакратычную для таго часу палітычную сістэму ад нападаў з боку метраполіі.

Паколькі асноўная задача рэвалюцый заключалася ў тым, каб садзейнічаць усталяванню і больш хуткаму развіццю буржуазнага грамадства, яны па свайму характару аб’ектыўна з’яўляюцца буржуазнымі. Таксама рэвалюцыі эпохі мануфактурнага капіталізму мы можам вызначыць як дэмакратычныя па сваім характары. У выніку іх перамогі ў краінах усталёўваліся канстытуцыйныя рэжымы, прадстаўнічыя формы кіравання. Дапускаўся палітычыны плюралізм. Такім чынам, палітычная сістэма станавілася больш дэмакратычнай у параўнанні з дарэвалюцыйнай эпохай.

Неабходна звярнуць увагу на асаблівасці характару Нідэрландскай, Партугальскай, Неапалітанскай і Першай Амерыканскай рэвалюцый. Яны былі не толькі буржуазныя, але і нацыянальна-вызваленчыя. У ходзе рэвалюцый названыя краіны вырашалі задачы вазвалення з-пад замежнага панавання і стварэння нацыянальных дзяржаў. Менавіта замежнае панаванне тут было галоўнай перашкодай на шляху развіцця буржуазных адносін, а таму стварэнне нацыянальных дзяржаў было важнейшай задачай у ходзе Нідэрландскай, Партугальскай, Неапалітанскай і Першай Амерыканскай рэвалюцый.

Рэвалюцыі эпохі мануфактурнага капіталізму з’яўляліся буржуазнымі па свайму характару зыходзячы і з вызначэння тых сацыяльных сіл, якім належала кіруючая роля ў ходзе рэвалюцый. Як правіла, у рэвалюцыях вывучаемай эпохі кіруючая роля належала буржуазіі. У дачыненні да Нідэрландскай рэвалюцыі можна ўдакладніць, што на момант яе пачатку буржуазія яшчэ не сфарміравалася ў поўнай меры як сацыяльны клас. Таму правільней гаварыць аб кіруючай ролі ў Нідэрландскай рэвалюцыі гарадскога патрыцыяту, гандлёва-фінансавай алігархіі. У ходзе Нідэрландскай рэвалюцыі саюзнікам гандлёва-фінансавай алігархіі стала дваранства, зацікаўленае ў вызваленні краіны ад іспанскага панавання. У Англіі саюзнікам буржуазіі выступіла новае дваранства. Будучы фактычна вясковымі прадпрымальнікамі, новыя дваране мелі агульны інтарэс з буржуазіяй у забеспячэнні свабоднага развіцця капіталістычных адносін. У час Першай Амерыканскай рэвалюцыі саюзнікам буржуазіі выступілі

плантатары рабаўладальнікі Поўдня. З буржуазіяй Поўначы іх аб'ядноўвала імкненне вызваліцца з-пад англійскага панавання, якое стала перашкодай для развіцця іх прадпрымальніцкай дзейнасці. Французская буржуазія ў час рэвалюцыі канца 18 ст. пайшла на саюз з сялянствам і гарадскім плебсам. Для таго каб сакрушыць Стары парадак, уласных сіл французскай буржуазіі аказалася недастаткова. Ёй патрэбен быў саюзнік. Ім не магло стаць новае дваранства, бо такі сацыяльны слой у Францыі не сфарміраваўся. Таму буржуазія звярнулася за падтрымкай да сацыяльных нізоў. Але пры гэтым неабходна ўлічваць, што плебс аб'ектыўна сваімі дзеяннямі садзейнічаў перамозе капіталізму, а не ствараў яму альтэрнатыву, нягледзячы на суб'ектыўныя памкненні плебейскага руху. Сфецыфічнай была сацыяльная база Партугальскай вайны за незалежнасць. Тут яшчэ не сфарміравалася буржуазія як колькі-небудзь значная сацыяльна-палітычная сіла, таму барацьбу за нацыянальнае вызваленне ўзначаліла мясцовая арыстакратыя. Мела сваю адметнасць сацыяльная база Неапалітанскай рэвалюцыі. У ходзе яе на вядучыя пазіцыі як рэвалюцыйная сіла выйшаў гарадскі плебс.

У ходзе Нідэрландскай, Партугальскай і Першай Амерканскай рэвалюцый асноўнай формай рэвалюцыйнай барацьбы ў сілу спецыфічнага характару гэтых рэвалюцый стала нацыянальна-вызваленчая вайна. Яна суправаджавалася і канфліктамі ўнутры нідэрландскага і амерыканскага грамадства, якія знаходзілі адлюстраванне ў грамадзянскай вайне. Аднак яна мела другараднае значэнне ў параўнанні з нацыянальна-вызваленчай. У час вайны Партугаліі за незалежнасць мы практычна не бачым значнага ўнутранага канфлікту.

Галоўны агульны вынік рэвалюцый заключаецца ў тым, што яны нанеслі ўдар па сістэме Старога парадку і паскорылі працэс мадэрнізацыі. У ходзе іх былі ліквідаваны многія элементы дакапіталістычных адносін у эканоміцы, якія перашкаджалі развіццю капіталістычнага ўкладу. Таксама была знішчана сістэма саслоўных прывілеяў, саслоўна-карпаратыўная структура грамадства. Праз рэвалюцыі зацвярджалася новая, буржуазная дзяржаўна-палітычная сістэма. Для яе характэрны прадстаўнічае канстытуцыйнае праўленне, палітычны плюралізм, абарона правоў і свабод асобы дзяржаваю. Новая дзяржаўная сістэма спрыяла развіццю новых грамадскіх адносін. Тут пэўнае выключэнне складае дзяржаўная сістэма Рэспублікі Злучаных Правінцый і Партугаліі. У РЗП улада аказалася ў руках фінансава-гандлёвай алігархіі, якая не была зацікаўлена ў развіцці прамысловага капіталізму. У Партугаліі ўсталявалася сістэма абсалютызму. Узніклі новыя незалежныя нацыянальныя дзяржавы: Рэспубліка Злучаных Правінцый, Партугалія, ЗША. Асабліва важным было ўзнікненне ЗША, бо гэта была першая дзяржава, створаная на аснове важнейшых прынцыпаў Асветніцтва: суверэнітэт народа, дагаварное паходжанне ўлады, натуральныя правы чалавека. Змянілася свядомасць людзей. Яны асэнсавалі сябе грамадзянамі, якія валодаюць наборам пэўных правоў і свабод.

Такім чынам, можна гаварыць, што рэвалюцыі не ажыццявілі, а паскорылі перход ад Старога парадку да Новага парадку. Але гэтае паскарэнне суправаджалася вялікімі грамадскімі выдаткамі, ахвярамі. Пераход пачаўся да рэвалюцый, адбываўся эвалюцыйнымі метадамі, працягваўся пасля рэвалюцый. Знікненне старога і станаўленне новага грамадства не ўяўляла сабой аднаактавы працэс, абмежаваны рамкамі буржуазнай рэвалюцыі. Ён быў больш працяглы. Рэвалюцыям існавала рэфармісцкая альтэрнатыва ў якасці спосаба мадэрнізацыі грамадства. Але нельга адвяргаць і важную ролю рэвалюцый у працэсе мадэрнізацыі. Прычым не толькі ў краіне, дзе яна адбывалася. Многія рэформы ў еўрапейскіх краінах ў пачатку 19 ст. адбываліся пад непасрэдным уплывам Французскай рэвалюцыі.